ў паэтэсы амаль няма вершаў сузіральніцкіх па адносінах да прыроды. Праз яднанне з прыродай і мастачка слова, і яе лірычная гераіня імкнуцца да духоўнага ўдасканалення.

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Бабарыка, Г. С. Дарога ў восень : зб. вершаў / Г. С. Бабарыка. – Брэст : Альтернатива, 2015. – 132 с.

**В. А. Буднік (г. Брэст, Беларусь)**

## ПРАБЛЕМАТЫКА І НАТАРАЛАГІЧНАЯ СПЕЦЫФІКА АПАВЯДАННЯ І. ПТАШНІКАВА «ЛЬВЫ»

У апошні час у беларускай літаратуры пачынаюць гучаць трывожныя і заклапочаныя словы аб будучым нашай прыроды. Атручванне прыроды звязана з дзейнасцю чалавека, якая і прывяла да самай страшнай катастрофы сучаснасці – аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Гэтай тэме прысвечаны творы І. Шамякіна (“Злая зорка”), І. Пташнікава (“Львы”), Б. Сачанкі (“Родны кут”, “Запіскі аб радыяцыі”), М. Матукоўскага (“Бездань”), І. Чыгрынава (“Хто вінаваты”, “Толькі мёртвыя не вяртаюцца”), А. Дударава (“Адцуранне”) і інш.

Кожны пісьменнік па-рознаму падыходзіць да асэнсавання чарнобыльскай катастрофы. Некаторыя аўтары ў сваіх творах робяць акцэнт не на саміх падзеях Чарнобыля, а на тым, што адбылося пасля трагедыі: як змянілася жыццё людзей, як змяніўся іх светапогляд і як змяніліся іх каштоўнасці. Адным з запамінальных твораў аб трагічных наступствах гэтай цывілізацыйнай катастрофы з’яўляецца апавяданне І. Пташнікава “Львы” (1987). Па трагічнай напоўненасці, па стылю “Львы” – адзін з самых драматычных твораў на чарнобыльскую тэму ў беларускай літаратуры. У цэнтры твора вобраз сабакі Джукі, які застаўся адзін і не ведае, чаму яго малады гаспадар так доўга не вяртаецца дамоў. І. Пташнікаў абірае адметную манеру – паказвае падзеі, якія адбываліся ў атручанай радыяцыяй вёсцы, праз успрыманне сабакі.

Мэтай дадзенага артыкула з’яўляецца даследаванне праблематыкі і нараталагічнай асаблівасці твора, аўтарскай манеры пісьма. У творы 2 групы герояў: ліквідатары, якія выконваюць загады, і вобраз жывой прыроды, якая гіне на стагоддзі. Праз успрыманне Джукі мы бачым не толькі свет людзей, але і прыроды. Багацце пачуццяў, думак такога героя вызначае арыгінальнасць наратыўнай мадэлі гэтага апавядання. У творы пераважае эмацыянальнае адчуванне жыцця. Джукі разумее: штосьці ідзе не так, як заўсёды, парушана яго звыклае жыццё. З першых радкоў твора

адчуваецца характэрны для творчасці пісьменніка драматызм. У творы назіраецца арыгінальнае зліццё аб'ектыўнай карціны наваколля, перададзенай праз успрыманне персанажа-сабакі (“*сіні іней лез ў вочы, нічым не пах*” [1, с. 88]; “*мёртвыя пчолы пад нагамі ў садзе*” [1, с. 89]) і напружанай духоўнай драмы, трагічнасці перажыванняў анімастычнага героя. Аб'ядноўваючы гэтыя два пласты, аўтар імкнуўся ўсёахопна паказаць маштабнасць катастрофы, трагізм падзей, якія адбыліся ў першыя тыдні пасля трагедыі ў Чарнобылі. У творы прасочваецца барацьба з радыяцыяй, ідзе маральнае выпрабаванне кожнага чалавека, удзельніка падзей. Недарэмна, выбіраючы апавяданню стратэгію, аўтар звяртаецца да прыёму ўспамінаў Джукі аб тым, як чамусьці гаспадар, калі развітваўся з ім, плакаў. Пісьменнік рознымі сродкамі падкрэслівае катастрафічнасць падзей для ўсяго жывога: чалавека, жывёлы, птушкі, расліны... Безумоўна, праз успамін Джукі аб развітанні з гаспадаром у чытачоў узнікае адчуванне безвыходнага драматызму, у якім апынулася ўсё жывое, і найперш людзі-“чарнобыльцы”. Мы разумеем, што Джукі – безабаронная ахвяра абставін. Праз яго вобраз ўвасабляецца маштабнасць і непапраўнасць трагедыі, якая закранула амаль што кожнага беларуса.

Моцнай эмацыянальнай афарбоўкай надзяляе І. Пташнікаў апісанні прыроды ў творы. Рэалізм І. Пташнікава вызначае не толькі меру таленту пісьменніка, але і асаблівасці яго стылю. Уражвае вельмі канкрэтнае адчуванне прыроды, уменне ўзнавіць яе нязвыклыя паслячарнобыльскія фарбы, гукі, пахі. Менавіта праз іх перадаецца адчуванне трагізму і напружанасці ў творы (“*...уся зямля, увесь Бабчын і нават зацягнутае густой тумановай завалаччу сіняе неба акрывавілася нейкай праціўнай успененай чырвонай жаўцізной...*” [1; с. 85]; “*ён (Джукі. – В. Б.) спыніўся ля ганка і задзёр угару галаву – у сінім небе над вескай нылі самалеты... і за спіной у хаце звінела радыё...*” [1, с. 93]). Адкрыццё свету ў зрокавых, пластычных вобразах, перадача рэальнага асяроддзя – аснова паэтыкі І. Пташнікава. Часам свабода асацыятыўных пераходаў ад аднаго назірання ці роздуму сабакі Джукі да другога набліжае манеру пісьма да “плыні свядомасці”. Напрыклад, пошукі сабакам гаспадара затым змяняюцца разважаннямі і думкамі Джукі. Псіхалагічны аналіз у апавяданні “Львы” ідзе побач з падрабязным выпісваннем канкрэтнай рэчаваснці асяроддзя (“*...усюды на траве ляжыць сіні дробненькі іней – насыпаўся як у восень*” [1, с. 86]), якая абуджае псіхічны стан галоўнага героя твора. Вось Джукі ўспамінае, як ён сустракаў гаспадара, як ён аблізваў нос яму.

Дэталізацыя і сімвалізм у І. Пташнікава – выяўленне яго пісьменніцкага светабачання. Вобраз у яго шматпланавы, у ім адчуваецца завершанасць, ідэйная ёмкасць і адначасова маляўнічасць. Напрыклад, радыё, якое яшчэ ў пачатку твора “крычала на ўсё горла” [1, с. 87], у канцы

"жудасна маўчала" [1, с. 97]. Шэраг разлічана расстаўленых вонкавых падрабязнасцяў, якія набываюць усё большае сімвалічае значэнне, набліжаючыся да кульмінацыі апавядання, перадаюць увесь жах рэчаіснасці, калі Джукі з кабіны вадзіцеля ўбачыў ужо адстрэленых сабак. Эмацыянальнае ўздзеянне ў апавяданні дасягаецца праз ўсёабдымнасць псіхалагічнага напружання, якое не знікае на працягу ўсяго твора.

Апавяданне заканчваецца сцэнай у кузаве вадзіцеля, дзе, як ільвы, ляжалі адстрэленыя сабакі і сабака Джукі, які скочыў на асфальт, бо не згадзіўся з абставінамі. Як і вадзіцель, чулы, адказны, які даў шанс яму, хоць і, верагодна, сам не верыў у станоўчы зыход. Ідэя бездапаможнасці жывёл, усёй прыроды перад катастрафічнымі наступствамі, безадказнасці чалавека за свае ўчынкі і навуковыя адкрыцці, – галоўная ў творы.

Апавяданне І. Пташнікава "Львы" мае адметную нараталагічную спецыфіку. Большасць падзей перадаецца праз успрыманне анімастычнага героя. Аўтар уражліва апісаў пакуты ад радыяцыі і яе наступстваў сабакі Джукі і яго суродзічаў. Пісьменнік змог чуйна, пранікліва ўявіць і пераканаўча перадаць складаную гаму перажыванняў жывога стварэння. Такі наратыўна-выяўленчы прыём збліжае апавяданне І. Пташнікава з творамі таленавітых празаікаў-анімалістаў – англічаніна Р. Эдамса, які напісаў раман "Чумныя сабакі", рускіх пісьменнікаў Г. Траяпольскага, аўтара вядомай аповесці "Белы Бім Чорнае Вуха", В. Бялова, аўтара цікавага зборніка "Апавяданні пра ўсякую жыўнасць".

Чарнобыль змусіў людзей пакінуць радзіму. Увесь трагізм гэтага вымушанага расстання раскрыты ў сцэне, калі малады гаспадар развітваецца з Джукі: "*Перад тым гаспадар пусціў яго ў хату і доўга гладзіў па галаве, гледзячы ў вочы. Пасля сам лізнуў яго, Джукі, у нос і заплакаў*" [1, с. 90]. Спецыялісты палічылі, што сабакі ў забруджанай зоне разносяць радыяцыю, таму іх вырашылі адстрэльваць. З гэтых жывых стварэнняў лезе поўсць, яны становяцца падобнымі на львоў. Джукі паўстае ў творы як істота з адкрытай і адданай душой, якой вельмі цяжка, балюча, трывожна. Аўтар надзяліў свайго героя тымі рысамі характару, якія ўласцівы не кожнаму чалавеку: вернасць, смеласць, настойлівасць, самаадданасць, прага да жыцця. Праз "ачалавечванне» героя-жывёлы мастак стварае разгорнуты, дасканалы вобраз, унутраны свет якога раскрывае чытачу.

Як можна пераканацца, нараталагічная спецыфіка твора І. Пташнікава ў многім вызначаецца вобразам анімастычнага апавядальніка – адметным светам і бачаннем падзей безабароннай і адданай людзям істоты. Праз светаадчуванне персанажа-сабакі рэцыпіент спасцігае падзеі, якія адбываюцца ў творы. Менавіта праз прызму ўспрымання сабакам акаляючага свету аўтар як бы выказвае нам і сваё светабачанне, і свае адносіны да падзей, якія прадстаўлены ў творы.

Спіс выкарыстанай літаратуры
1. Пташнікаў, І. М. Львы : апавяданне / І. Пташнікаў // Тартак : аповесць і апавяданні / І. Пташнікаў. – Мінск : Маст. літ., 1997. – С. 288–304.

**Л. М. Грыцук (г. Брэст, Беларусь)**

## АБАЗНАЧЭННЕ ХРАНАТОПУ Ў ТЭКСТАХ ЭЛЕГІЙ В. ЖУКОЎСКАГА

Першымі па часе ў рускай паэзіі (акрамя элегій В. Трэдзьякоўскага і К. Бацюшкава) лічацца элегіі Васіля Жукоўскага (“Вечар”, “Сельскія могілкі”, “Грэева элегія, перакладзеная з англійскай мовы”). Руская элегія, у адрозненне ад антычнай, набывае новыя рысы: змест яе становіцца больш шматгранны; паэты паказваюць розныя сферы жыцця – грамадзянскага, інтымнага; форма элегіі стала раскаваная ў рытміка-інтанацыйных адносінах; памер твораў не абмяжоўваецца. Элегіі з’явіліся новымі творамі, узорамі невядомай раней для Расіі элегічнай змястоўнасці – узорамі “кладбищенской” элегіі, вытокамі якой сталі паэтычныя творы Дж. Мільтана, Э. Юнга, Р. Бернса, Г. Гейнэ, Э. Верхарна. Тэрмінам “элегія”, аднак, карысталіся асцярожна. Б. Эйхенбаум адзначае ў сувязі з гэтым: “Жукоўскі прыходзіць да новых формаў невялікіх “песень” і інтымных элегій, развіваючы напеўны тып лірыкі” [3, с. 28].

Элегія, як і ўвогуле мастацкая літаратура, заклікана адлюстроўваць навакольную рэчаіснасць, у тым ліку і жыццё чалавека, яго думкі, перажыванні, учынкі і падзеі. Катэгорыя прасторы і часу пры гэтым з’яўляецца неад’емным кампанентам пабудовы аўтарскай карціны свету. Само паняцце хранатоп паходзіць ад старажытнагрэчаскіх *chronos* (час) і *topos* (месца) і абазначае яднанне прасторавых і часавых параметраў, накіраванае на выражэнне пэўнага сэнсу. Распаўсюджванне вызначэння хранатопу ў літаратуры – гэта заслуга вядомага рускага вучонага, філосафа, літаратуразнаўца, філолага і культуролага М.М. Бахціна, які пісаў: “Істотную ўзаемасувязь часавых і прасторавых адносін, мастацка асвоеных у літаратуры, мы будзем называць хранатопам” [1, с. 234].

М.М. Бахцін у асноўнай працы, прысвечанай катэгорыі часу і прасторы, лічыў, што “ў літаратурна-мастацкім хранатопе мае месца зліццё прасторавых і часавых прыкмет у асэнсаваным і канкрэтным цэлым. Час тут згушчаецца, ушчыльняецца, становіцца мастацка-бачным; прастора ж інтэнсіфіцыруецца, уцягваецца ў рух часу, сюжэту, гісторыі. Прыкметы часу раскрываюцца ў прасторы, і прастора асэнсоўваецца і вымяраецца часам” [1, с. 235]. Час і прастора ў літаратурным творы – галоўныя складнікі мастацкага вобраза, якія спрыяюць цэласнаму ўспрыманню мастацкай рэчаіснасці і арганізуюць кампазіцыю твора. Варта адзначыць, што пры